# Сямейны капітал: што зменіцца з 1 студзеня 2020 года

З 2015 года ў Беларусі дзейнічае мера доўгатэрміновай падтрымкі-сямейны капітал. Права на яго прызначэнне і аднаразовую выплату дае нараджэнне ў сям’і трэцяга або наступнага дзіцяці. На 1 снежня бягучага года больш за 700 сем’яў адкрылі дэпазітныя рахункі сямейнага капіталу. Аб гэтым журналісту «Маяка» распавяла намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага райвыканкама Алена Яфрэменка.

Дзеючая праграма сямейнага капіталу заканчваецца 31 снежня 2019 года. У сувязі з гэтым 18 верасня Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам было прынятае рашэнне аб працягу праграмы на 2020-2024 гады. Прычым яна будзе дапоўнена важнай навацыяй:

— Цяпер для таго, каб скарыстацца сродкамі, якія ляжаць на дэпазіце, трэба дачакацца 18-годдзя дзіцяці, у сувязі з нараджэннем якога быў прызначаны капітал. З 1 студзеня 2020 года такой Умовы ўжо не будзе, і сем’і змогуць датэрмінова скарыстацца гэтымі сродкамі — — патлумачыла Алена Мікалаеўна. — Грошы можна будзе выкарыстоўваць на будаўніцтва, рэканструкцыю або набыццё жылля (калі шматдзетная сям’я мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў), на атрыманне адукацыі на платнай аснове або на некаторыя віды платных медыцынскіх паслуг.

Нагадаем, праграма сямейнага капіталу з’яўляецца доўгатэрміновай дзейснай мерай у сістэме дзяржаўнай падтрымкі шматдзетных сем’яў. З 1 студзеня 2020 года сямейны капітал усталёўваецца ў Памеры 22,5 тысячы рублёў і прызначаецца пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей у перыяд з 1 студзеня 2020 па 31 сьнежня 2024 года.

Выплата будзе ажыццяўляцца ў памеры, які дзейнічае на дату нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей. Калі сямейны капітал прызначаны па праграме 2015-2019 гадоў, правы на яго прызначэнне ў перыяд 2020-2024 гадоў у сям'і не будзе. То бок, калі трэцяе або наступнае дзіця народзіцца ўжо 1 студзеня, сям'я можа прэтэндаваць на новы памер сямейнага капіталу.

– Калі раней гэта было 10 тысяч даляраў, то цяпер-22,5 тысячы рублёў. Для захавання пакупніцкай здольнасці сямейнага капіталу ён будзе штогод індэксавацца на індэкс спажывецкіх цэн за мінулы год, і з 1 студзеня наступнага года будзе зацвярджацца яго новы памер, – адзначыла Алена Яфрэменка.

**Важна**

Аднаразовая дзяржаўная падтрымка можа быць выкарыстана ў поўным аб'ёме альбо па частках у безнаяўным парадку, у тым ліку датэрмінова на платныя медыцынскія паслугі (незалежна ад даты прызначэння). Неабходнасць у гэтым пацвярджаецца заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

Для заключэння дагавора ў медыцынскую ўстанову, дзе будзе аказвацца дапамога, неабходна прадаставіць копію рашэння (выпіску з рашэння) аб распараджэнні (датэрміновым распараджэнні) сродкамі сямейнага капіталу, прынятага мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі (пры датэрміновым выкарыстанні) і іншыя дакументы.

Затым грамадзяне павінны звярнуцца з пакетам дакументаў у падраздзяленні Беларусбанка, якія ажыццяўляюць аперацыі па ўкладах "Сямейны капітал". Банк у сваю чаргу пералічыць грошы на рахунак медыцынскай установы. Нявыкарыстаныя сродкі вяртаюцца на працягу трох рабочых дзён з моманту выканання работ.